Источник: "Народная газета" - 2017-05-19

# САДУ — ЦВІСЦІ!

**Максім Осіпаў**
*osipov@sb.by*

Пладовыя дрэвы, а таксама ягаднікі пацярпелі ад вясновых замаразкаў і не прынясуць вялікага ўраджаю, папярэджвае Мінсельгасхарч. Сапраўды, канец красавіка і пачатак мая ў нашай краіне выдаліся нетыпова халоднымі. Цвіценне пладовых дрэў і кустоў пачалося пазней, чым звычайна, пупышкі ў садах сталі пашкоджвацца яшчэ да цвіцення. Па поўдні краіны цвіценне садоў пачалося ў першай дэкадзе мая, але халоднае надвор'е можа ўнесці істотныя карэктывы ва ўраджайнасць цяперашняга года.

Аднак ёсць і добрыя навіны. У Мінсельгасхарчы нагадваюць, што якраз у 2017-м пачнуць пладаносіць пасаджаныя 14 гадоў таму яблыні і грушы. Усё гэта дазваляе спадзявацца на павелічэнне ўраджайнасці пладовых культур — калі не ў гэтым годзе, то ў будучым. Іншая справа нашы традыцыйныя агародныя культуры. Спецыялісты Інстытута агародніцтва кажуць, што найбольш абаронена ад холаду бульба, якая знаходзіцца ў зямлі і яшчэ не прарасла. Не страшны холад і цыбулі, пасеянай насеннем, а таксама пятрушцы, кропу і сельдэрэю. Самая ж слабая ад невясновых капрызаў надвор'я гародніна — цеплалюбівыя памідоры, агуркі, баклажаны і перцы. Зрэшты, калі яны знаходзяцца ў цяпліцы пад поліэтыленам, страты і тут будуць мінімальнымі.

## КАМПЕТЭНТНА



**Анатоль Крываротт,** выконваючы абавязкі дырэктара РУП "Інстытут пладаводства", намеснік дырэктара па навуковай рабоце кандыдат сельскагаспадарчых навук:

— Культуры, якія традыцыйна ў нас вырошчваюцца, могуць пераносіць пахаладанні і іншыя ваганні клімату. Ад катаклізмаў не застрахаваны ніхто, але ў дадзеным выпадку нічога катастрафічнага я не бачу. Нават культуры, няўстойлівыя да замаразкаў, прадстаўлены гатункамі рознага тэрміну паспявання — познімі, раннімі, сярэднімі. І калі ў якім-небудзь рэгіёне пахаладанне прыйшлося на цвіценне ранніх гатункаў, то з пэўнай верагоднасцю можна меркаваць, што пазнейшыя гатункі гэтага пазбеглі. У прыватнасці, яблыні ў момант рэзкага пахаладання 9 мая па краіне яшчэ практычна не цвілі. А ўлічваючы, што менавіта яблыня складае ў нас аснову валавога збору ўраджаю пладовых культур, у нас ёсць усе падставы чакаць ураджаю. У цэлым жа па пладовых культурах у садаводаў і вучоных стрыманы аптымізм. Прынамсі, няма падстаў драматызаваць сітуацыю.

Максім Осіпаў. Саду - цвісці!